РАШЭННЕ
калегіі ўпраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама

23 сакавіка 2022 г. № 3
г. Брэст

Аб выніках абласнога тура
ХХХ рэспубліканскага конкурсу
«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай
культуры»

Краязнаўства, гісторыка-культурная спадчына з'яўляюцца спрадвечнымі крыніцамі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. З мэтай узмацнення ролі публічных бібліятэк у зборы, захаванні і папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве, нацыянальнай гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры, а таксама для падтрымкі і развіцця чытання праводзіцца чарговы тур рэспубліканскага штогадовага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

На абласны тур ХХХ рэспубліканскага агляду-конкурсу былі прадстаўлены 13 матэрыялаў ад наступных бібліятэк: Баранавіцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя В.Таўлая ДУК «ЦБС г. Баранавічы», Ганцавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя В.Ф.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая РЦБС», Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Кобрынская РЦБС», Лунінецкая цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Лунінецкая РЦБС», Ляхавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы ДУК «Ляхавіцкая РЦБС», Пінская гарадская цэнтральная бібліятэка ДУК «Пінская ГЦБС», Столінская цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Столінская РБС», бібліятэка-бібліобус ДУК «ЦРБ імя Ф.І.Панфёрава» г. Іванава, Мілавідская сельская бібліятэка ДУК «Баранавіцкая РЦБС», Пескаўская сельская бібліятэка ДУК «Бярозаўская РБС», Целяханская гарпасялковая бібліятэка ДУК «Івацэвіцкая РБС», Малоткавіцкая сельская бібліятэка ДУК «Пінская РЦБС», Шарашоўская сельская бібліятэка ДУК «Пружанская ЦБС».

Матэрыялы, якія былі прадстаўлены ў абласны аргкамітэт, уключалі: заяўку, інфармацыйную і аналітычную даведкі аб рабоце бібліятэк за апошнія тры гады, ксеракопію статута ўстановы культуры, дадаткі ў выглядзе інфармацыйна-бібліяграфічных і аналітычных матэрыялаў, рэкламнай і выдавецкай прадукцыі, сцэнарных і электронных матэрыялаў, прэзентацый, відэаролікаў і г.д.

Разгледзеўшы конкурсныя матэрыялы і заслухаўшы інфармацыю дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М.Горкага Стрыжэвіч А.Я.,

калегія ўпраўлення культуры ВЫРАШЫЛА:

1. Прызнаць пераможцамі абласнога тура і прадставіць для ўдзелу ў XXX рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Столінскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Столінская раённая бібліятэчная сістэма» (дырэктар Ляшкевіч Іван Пятровіч) – I месца за плённую працу па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі спадчыны знакамітага майстра І.П.Супрунчыка праз стварэнне інфармацыйнага краязнаўчага рэсурсу «Іван Супрунчык. Ад слова да дрэва»;

Ляхавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Купалы ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Пляшэвіч Вольга Анатольеўна) – II месца за шматгранную пошукавую працу па даследаванні матэрыялаў пра калгасы на тэрыторыі Ляхавіцкага раёна і стварэнне электроннай базы даных «Зямля яднае і ўзбагачае: гісторыя сельскіх гаспадарак Ляхавіччыны»;

Пінскую гарадскую цэнтральную бібліятэку ДУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Лагодзіч Дзіна Анатольеўна) – III месца за збор, сістэматызацыю і папулярызацыю матэрыялаў пра ганаровых грамадзян горада Пінска; распрацоўку электроннага рэсурсу «Пинск: события, лица».

Сярод сельскіх бібліятэк:

Пескаўскую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма» (загадчык Міллер Наталля Сцяпанаўна) – I месца за мэтанакіраваную пошукавую дзейнасць па зборы і даследаванні матэрыялаў пра генерал-лейтэнанта, удзельніка Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войн С.І.Любарскага, ажыццяўленне праекта «О герое былых времён».

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Лунінецкую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Кішкевіч Алена Васільеўна) – I месца за інавацыйны падыход да папулярызацыі бібліятэкі, кнігі і чытання ў межах рэалізацыі праекта для аматараў графічнай літаратуры «Библиотечная Комикс-лига»;

Баранавіцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя В.Таўлая ДУК «ЦБС г. Баранавічы» (дырэктар Барзілава Алена Аляксандраўна) – II месца за ўкараненне крэатыўных інтэрактыўных форм работы праз распрацоўку і рэалізацыю праекта «Библиогид. Неэкскурсии по городу»;

Кобрынскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Легацюк Ларыса Віктараўна) – III месца за фарміраванне актыўнага культурнага асяроддзя і стварэнне вакальнай групы «Фантазия», якая спрыяе павышэнню якасці культурна-масавых мерапрыемстваў.

Сярод сельскіх бібліятэк:

Шарашоўскую гарпасялковую бібліятэку ДУК «Пружанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (бібліятэкар Фасевіч Вольга Уладзіміраўна) – I месца за вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны мясцовасці, фарміраванне пачуцця гонару за сваю малую радзіму і арганізацыю экскурсіі «Родны край: вядомы і невядомы».

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Ф.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Хваль Ала Уладзіміраўна) – I месца за шматгранную актыўную дзейнасць па прыцягненню да чытання і распрацоўку праекта па папулярызацыі творчасці літаратараў-землякоў «Літаратурны краязнаўчы чэлендж».

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем».

Сярод сельскіх бібліятэк:

Мілавідскую сельскую бібліятэку ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (бібліятэкар Ваўчок Зоя Маркаўна) – I месца за плённую працу па фарміраванні экалагічнай культуры падрастаючага пакалення, прыцягненне ўвагі чытачоў да экалагічных праблем сваёй малой радзімы і стварэнне інфармацыйнай прадукцыі эка-накіраванасці.

2. Пераможцаў абласнога тура XXX рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ўзнагародзіць дыпломамі.

3. Прадставіць для ўдзелу ў XXX рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

Столінскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Столінская раённая бібліятэчная сістэма»;

Пескаўскую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма»;

Лунінецкую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Шарашоўскую горпасялковую бібліятэку ДУК «Пружанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Ф.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Мілавідскую сельскую бібліятэку ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

4. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М.Горкага Стрыжэвіч А.Я.

Намеснік старшыні калегіі,
намеснік начальніка ўпраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама А.М.Козіч

Рэспубліка Беларусь Упраўленне культуры Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта
Для дакументаў